ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік галоўнага ўпраўлення адукацыі Гродзенскага аблвыканкама
Р.Ю.Абрамчык
04.11. 2020

# II ЭТАП РЭСПУБЛІКАНСКАЙ АЛІМПІЯДЫ ПА ВУЧЭБНЫХ ПРАДМЕТАХ “БЕЛАРУСКАЯ МОВА” І “БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА”

## КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА

## XI КЛАС

| **Заданні** | **1** | **2** | **3** | **4** | **5** | **6** | **7** | **8** | **9** | **10** | **Усяго** |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Балы** | | | | | | | | | | | |

*22 лістапада 2020 г.*

**Заданне 1.** Запішыце словамі нумары парадкавых лічэбнікаў, якія адпавядаюць правільным адказам.

*Максімальны бал — 5.*

**I.** Правільна складзеныя прапорцыі з пункту гледжання словаўтваральнага тыпу:
1. Баяністка : баяніст: гарністка : гарніст.
2. Турцыя : турэцкі = Баранавічы : баранавіцкі.
3. Спаць : спальня = чытаць : чытальня.
4. Бетоншчык : бетон = разліўшчык : разліваць.
5. Настаўніца : настаўнік = салатніца : салат.

**II.** Неразвітыя сказы.
6. Госці ўмелі трымаць язык за зубамі.
7. На мяне пачалі ўсе людзі паказваць пальцам.
8. Зіма была на зыходзе.
9. Коннікаў было двое.
10. Малюнак ужо ёсць мастацтва.

**Адказ:** ______________________________________________________________
______________________________________________________________________

***Тэкст да заданняў 2–4.***

(1) Верш М. Багдановіча «Раманс» належыць да інтымнай лірыкі. (2) Гэта невялікі твор песеннага складу на тэму кахання. (3) У ім аўтар услаўляе маладосць лепшую пару жыцця пару светлага пачуцця, якое ўзвышае чалавека, робіць яго **духоўна** прыгожым.

(4) Да тэмы кахання звярталіся і звяртаюцца паэты ўсіх часоў і народаў. (5) Да «Раманса» ёсць эпіграф радкі з верша французскага паэта Сюлі-Прудома. (6) У перакладзе на беларускую мову яны гучаць так:

Калі заблішча гэта зорка,
Самая цудоўная, самая далёкая,
Скажыце ёй, што ёй належыць маё каханне,
О, апошнія з чалавечага роду.

(7) Эпіграф ключ да разумення асноўнай думкі твора. (8) Сюлі-Прудом раскрываў унутраны свет чалавека, яго інтымныя перажыванні. (10) Радкамі з верша Сюлі-Прудома, **дзе**, як і ў «Рамансе», выкарыстоўваецца вобраз зоркі, М. Багдановіч падкрэсліў, што тэма кахання вечная і агульначалавечая.

(11) У вершы паэт гаворыць ад уласнага імя, ад першай асобы. (12) Гэта — верш-маналог. (13) Думкі паэта такія блізкія і зразумелыя, што аўтарскае «я» зліваецца з асабістым, інтымным кожнага чалавека. (14) Таму так блізка і **задушэўна** ўспрымае чытач радкі верша.

(15) Аўтар звярнуўся да традыцыйных паэтычных вобразаў неба і зоркі. (16) Гэтыя словы ў паэтычнай мове верша апорныя. (17) Знаёмства з дзяўчынай, радасць першага спаткання, смутак развітання ўсё гэта напаўняе душу лірычнага героя і асацыіруецца з вобразам светлай і далёкай зоркі Венеры сімвала кахання, маладосці.

*Э. Блінава*

**Заданне 2.** Патлумачце значэнне літаратуразнаўчых тэрмінаў, выкарыстаных у тэксце.

*Максімальны бал — 5.*

1.Інтымная лірыка — ____________________________________________
____________________________________________
____________________________________________

2. Эпіграф — ____________________________________________
____________________________________________
____________________________________________

3. Маналог ____________________________________________
____________________________________________
____________________________________________

4. Лірычны герой — ____________________________________________
____________________________________________
____________________________________________

5. Сімвал (у літаратуры) — ____________________________________________
____________________________________________
____________________________________________

**Заданне 3.** Выпішыце з тэксту ўказаныя адзінкі.

*Максімальны бал — 5.*

| | |
|---|---|
| 1. Сінонім-прыметнік да слоў: *глыбока асабісты, патаемны, запаветны*. | |
| 2. Слова, якое адпавядае значэнню: ‘пачуццё суму, маркоты, жалю’: | |

| | |
|---|---|
| 3. Дзеяслоў, у якім выдзяляецца постфікс ***-ца***. | |
| 4. З ***13-га*** сказа словы, у якіх вымаўленне і напісанне не супадаюць. | |
| 5. Часцінамоўную прыналежнасць выдзеленага ў 10-м сказе слова. | |

**Заданне 4.** Адкажыце на пытанні.

*Максімальны бал — 5.*

1. Якое слова будзе з'яўляцца антонімам да выдзеленага прыслоўя у ***3-м*** сказе?
_______________________________________________

2. Устанавіце нумар сказа, у якім прапушчаны два працяжнікі. Запішыце гэты лічэбнік у форме творнага склону: ________________________________________

3. Зпішыце дзеяслоў у форме інфінітыва, які адпавядае значэнню '*падаваць у парадыйным выглядзе*': ________________________________________________

4. Якім будзе словаўтваральны ланцужок да падкрэсленага ў 14-м сказе слова? Узнавіце і запішыце два словы:
<u>задушэўна</u> < ____________________________ < _______________________

5. Словазлучэнне з тэксту "ключ да разумення" перакладаем на рускую мову як "ключ к пониманию". А як перакласці на беларускую мову рускі фразеалагізм "жизнь бьёт ключом"? Запішыце: _____________________________________________
____________________________________________________________________

**Заданне 5.** I. Суаднясіце рускамоўныя выразы і іх аднаслоўныя беларускія (літаратурны і абласныя) адпаведнікі. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў без прабелаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць левага слупка.

*Максімальны бал — 2,5.*

| | |
|---|---|
| А) коврик под ноги;<br>Б) самодельный деревянный протез для ноги;<br>В) летучая мышь;<br>Г) сборник католических молитвенных песень;<br>Д) кукурузный початок | 1) кажан;<br>2) кіях;<br>3) каберац;<br>4) кантычка;<br>5) кавяла |

А___Б___В___Г___Д___

II. Суаднясіце выдзеленыя словы ў сказах і іх сінтаксічную функцыю. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў без прабелаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць левага слупка.

*Максімальны бал — 2,5.*

| | |
|---|---|
| А) **Абсохлая** зямля пачала іскрыцца аксамітам кволай пахучай траўкі.<br>Б) **Паляваць** тут забаронена.<br>В) Паэт умее прымусіць чытача паўней **адчуць** і глыбей **ацаніць** вобразы.<br>Г) З сосен **цурком** бегла вада. | 1) дзейнік;<br>2) выказнік;<br>3) дапаўненне;<br>4) азначэнне;<br>5) акалічнасць. |

| | |
|---|---|
| Д) **Спяваюць** птушкі з самай раніцы. | |

А___Б___В___Г___Д___

**Заданне 6.** Запішыце фразеалагізмы па-беларуску, захоўваючы лексічныя і граматычныя нормы беларускай мовы. Пастаўце націскі.

*Максімальны бал — 5.*

| Руская мова | Беларуская мова |
|---|---|
| В двух слова́х | |
| Держать ухо востро́ | |
| По пята́м | |
| И бровью не ведет | |
| Как две ка́пли воды | |
| Ни в коем слу́чае | |
| Закрасться в ду́шу | |
| Нечего говорить | |
| Играть в прятки | |
| Под горячую ру́ку | |

**Заданне 7.** Узнавіце злучнікі і прапушчаныя складаныя сказы. Запоўніце табліцу.

*Максімальны бал — 6.*

| Маўленчая сітуацыя | Злучнік | Складаны сказ |
|---|---|---|
| Гэты злучнік з'яўляецца стылістычна нейтральным і найбольш ужывальным для выражэння адносін адначасовасці ці паслядоўнасці | | |
| Служыць для аб'яднання частак, у якіх выражаецца значэнне папераменнасці або чаргавання з'яў і падзей | | |
| Паказваюць на пералічэнне ўзаемна выключальных з'яў і падзей з дадатковым адценнем меркавання ці развагі | | |

**Заданне 8.** Утварыце складаныя словы, адпаведныя ўказаным значэнням, і прыдумайце з імі словазлучэнні. Запішыце.

*Максімальны бал — 4 (0,5 бала за кожную запоўненую клетку).*

| Складанае слова | Значэнне слова | Словазлучэнне-прыклад |
|---|---|---|
| | з гладкім ствалом (пра дрэвы) | |
| | з гладкім, не наразным ствалом (пра зброю) | |
| | які мае адносіны да здабычы, апрацоўкі рыбы, прыгатавання з яе прадуктаў | |
| | які мае адносіны да рыбнага промыслу | |

**Заданне 9.** Запішыце назвы вершаў М. Багдановіча.

*Максімальны бал — 5.*

| Радкі з верша | Назва |
|---|---|
| Як мары, белыя бярозы<br>Пад сінявой начной стаяць,<br>У небе зоркі ад марозу<br>Пахаладзеўшыя дрыжаць. | |
| На чыстым аркушы, прад вузенькім акном,<br>Прыгожа літары выводзіць ён пяром,<br>Ўстаўляючы паміж іх чорнымі радамі<br>Чырвоную страку… | |
| Хоць зернейкі засохшымі былі,<br>Усё ж такі жыццёвая іх сіла<br>Збудзілася і буйна ўскаласіла… | |
| І пільна летапіс другі ўжо год пішу:<br>Старанна літары малыя вываджу<br>І спісваю ўсё ад слова і да слова<br>З даўнейшых граматак пра долю Магілёва. | |
| Помніш толькі красу,<br>Мілы тварык дзявочы,<br>Залатую касу,<br>Сіняватыя вочы. | |

**Заданне 10.** На думку навукоўцаў, такая паэтычная фігура, як параўнанне выконвае ў мастацкім творы чатыры характэрныя функцыі: 1) ацэначна-характарыстычная функцыя — звязана з праявай у параўнанні аўтарскай мадальнасці; 2) суб'ектыўна-пазнавальная функцыя — звязана з адлюстраваннем у параўнанні пункту гледжання персанажа; 3) функцыя канкрэтызацыі — звязана з апісаннем пры дапамозе параўнанняў псіхалагічных і эмацыйных станаў, рухаў, жэстаў; 4) апісальна-выяўленчая функцыя — звязана са стварэннем пры дапамозе параўнанняў

пейзажных замалёвак і іншых апісанняў. Вызначце і запішыце, якую функцыю выконвае параўнанне ў творах Г. Бураўкіна.

*Максімальны бал — 5.*

| Фрагменты з твораў Г. Бураўкіна | Функцыя |
|---|---|
| 1. «А шэпт твой горкі ўсё па сэрцы б’е, / Як жураўліны кліч, / Як крык адчаю» | |
| 2. «Сад звонка лапатаў пасля дажджу – / Як быццам тысяча срабрыстых гномікаў / Саскоквала з галінкі на галінку» | |
| 3. «Прыгажунь не злічыць. / То – нібы сон-трава баравая, / То – як зорка Венера ўначы...» | |
| 4. «Зноў прымушае здзіўлена спыніцца / Жаночы цуд, / Як гэты свет, / Стары». | |
| 5. «Чаромхавая бель – / Як цёплы снег, / Як незаплямлены вясельны вэлюм...» | |